*С. А. Паўлава,*
*кандыдат філалагічных навук,*
*прафесар кафедры менеджмэнту*
*інфармацыйна-дакументнай сферы*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# ПАДПОЛЬНЫ ДРУК БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нашым сучаснікам, якія ведаюць пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны з кніг і ўспамінаў яе непасрэдных удзельнікаў, цікава ведаць і зразумець, што ж маральна падтрымлівала савецкіх людзей, напаўняла веру ў перамогу, якім быў іх духоўны свет, чым яны жылі, што чыталі, аб чым расказвалі, спявалі ў той час. І хоць ад тых далекіх суровых дзён нас аддзяляе 70 гадоў, многія падзеі мінулых часоў не страцілі свайго значэння, па-ранейшаму хвалююць сучаснага чытача.

Аб гераічнай барацьбе савецкага народа ў час Вялікай Айчыннай вайны напісана нямала кніг. Сярод іх мастацкія творы, манаграфіі, нарысы, мемуары. Аднак і сёння, праз шмат гадоў пасля заканчэння вайны, яшчэ недастаткова даследаваны роля кнігі ў жыцці партызан. Між тым, кніга, газета, лістоўка, творы вуснай народнай творчасці адыгралі вялікую ролю ў духоўным жыцці беларускага народа. Таму вельмі важна ведаць, што чыталі партызаны ў час вайны, выявіць асноўныя тэндэнцыі і заканамернасці развіцця чытацкай цікавасці, яго сувязь з жыццём і барацьбой савецкіх людзей, ідэйна-эстэтычную значнасць і пазнавальна-выхаваўчае значэнне для сучаснікаў.

Наша кнігазнаўчая навука мае шэраг прац па гісторыі чытача. Некаторыя звесткі пра чытача-партызана, яго дачыненні да друкаванага слова змяшчае навуковая літаратура, прысвечаная вывучэнню партызанскага руху ва ўсей яго шматпланавасці. [1; 3; 11].

Каштоўнай крыніцай па вывучэнні чытача-партызана з’яўляюцца мемуары актыўных удзельнікаў гераічнай барацьбы ў тыле ворага. Суб’ектыўны фактар з’яўляецца важным момантам у кнігазнаўчых даследаваннях. У сувязі з гэтым для нас вялікае значэнне маюць успаміны партыйных работнікаў і партызанскіх журналістаў, тых, хто меў дачыненне да партызанскага друку. У іх мемуарах

утрымліваецца цікавы матэрыял аб стварэнні паліграфічнай базы ва ўмовах ваеннага часу, выпуску газет, лістовак, зводак і іншай прадукцыі, яе распаўсюджванні сярод партызан і мясцовага насельніцтва.

Пачатак выдавецкай дзейнасці падпольных антыфашысцкіх арганізацый і партызанскіх фарміраванняў звязаны з выпускам лістовак, бюлетэня «Весткі з Савецкай Радзімы», зваротаў, заклікаў і іншых форм малога друку. Праца па выданні лістовак і зваротаў займала ў дзейнасці антыфашысцкіх арганізацый у тыле ворага важнае месца на працягу ўсёй вайны. Гэта тлумачыцца тым, што зрабіць іх можна было найпростым спосабам: размножыць ад рукі або на пішучай машынцы. У параўнанні з газетай, тэксты лістовак і зваротаў былі кароткімі, фармат невялікі, што дазваляла аператыўна адгукацца на тэмы дня, менш затрачваць сіл і энергіі на выданне і дастаўку да месца прызначэння.

Першыя лістоўкі з'явіліся на акупаванай тэрыторыі Беларусі амаль адразу ж пасля захопу яе фашысцкімі войскамі. Яны былі, як правіла, рукапісныя або надрукаваныя на машынцы. Гэта звароты да насельніцтва, складзеныя падпольшчыкамі і партызанамі. Патрыёты адной з падпольных арганізацый г. Бабруйска ўжо ў 1941 г. адрамантавалі радыёпрыёмнік, арганізавалі запіс паведамленняў маскоўскага радыё і друкавалі іх на пішучай машынцы [12, с. 140].

Партызаны праяўлялі шмат вынаходлівасці і адвагі ў справе выпуску лістовак. У першы час, калі яшчэ не была створана ўласная паліграфічная база, яны выкарыстоўвалі ўсе магчымасці для друкавання лістовак, у тым ліку і гітлераўскія друкарні. Так, у Лепельскай друкарні, дзе працаваў наборшчыкам С. Г. Бараноўскі – сакратар падпольнай антыфашысцкай арганізацыі – здолелі нелегальна надрукаваць значную колькасць лістовак [10].

Журналіст Я. І. Казачук, уладкаваўшыся на працу ў друкарню, якую фашысты адкрылі ў г. п. Хойнікі, стварыў і ўзначаліў падпольную патрыятычную арганізацыю. Неўзабаве ім і яго таварышамі па барацьбе былі выпушчаныя першыя лістоўкі, надрукаваныя друкарскім спосабам. Тэксты лістовак пісаў Я. І. Казачук. Ён загінуў восенню 1943 г., калі ў складзе партызанскага атрада ўдзельнічаў у налёце на нямецкую друкарню, каб захапіць неабходнае абсталяванне для выдання газеты [5].

У некаторых падпольных арганізацыях былі прымітыўныя друкаваныя станкі, што давала магчымасць павялічваць тыражы лістовак. Са стварэннем паліграфічнай базы выданне лістовак і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

блізкіх ім па змесце, фармату і аб'ёму зваротаў значна павялічылася. Лістоўкі сталі выходзіць рэгулярна, вялікімі накладамі, своечасова інфармаваць аб становішчы на фронце. Непасрэдны зварот да пэўных сацыяльных пластоў партызан-чытачоў было характэрным для зместу лістовак, якія распаўсюджваліся ў тыле ворага: рабочым (іх было 17,01 % сярод партызан Беларусі), калгаснікам (39,61 %), навучэнцам (12,16 %), ваеннаслужачым і іншым. Вось назвы некаторых лістовак, выдадзеных у рэспубліцы ў 1942–1943 гг.: «Да калгаснікаў, калгасніц, рабочых і сялян, партызан, школьнікаў і піянераў»; «Да працоўных часова акупаваных гарадоў Беларусі»; «Чыгуначнік Беларусі»; «Сяляне і сялянкі Беларусі»; «Рыбакі Нарачы»; «На свяшчэнны бой, юнакі і дзяўчаты Палесся»; «Сяляне Слутчыны»; «Да зброі, слаўная беларуская моладзь» [7]. Значная колькасць лістовак прысвячалася жанчынам-партызанкам, што складалі 16 % усіх партызанаў. Напрыклад, «Працоўныя жанчыны, родныя маці і сёстры нашы!», «Да жанчын Віцебскай вобласці» [7].

Акрамя лістовак, у гады Вялікай Айчыннай вайны аператыўнай крыніцай інфармацыі была газета. Для выдання газет камандаванне партызанскіх фарміраванняў праводзіла велізарную працу ва ўмовах акупацыі.

Некаторая колькасць неабходнага абсталявання, асабліва ў пачатку вайны, была здабыта падпольшчыкамі з друкарняў, створаных акупацыйнымі ўладамі, як правіла, на базе былых раённых і гарадскіх друкарняў, не эвакуяваных летам 1941 г. Так, падпольшчык г. Асіповічы І. К. Патоцкі, звязаўшыся з надзейнымі людзьмі, што працавалі ў друкарні, здабываў з іх дапамогай шрыфты, фарбу, паперу і перадаваў партызанам. Шмат шрыфтоў перадала ў лес подпольшчыца Е. Н. Буднік [8]. Яны паслужылі асновай для стварэння партызанскай друкарні.

У сталіцы нашай краіны ва ўмовах акупацыі гарадскім партыйным камітэтам была праведзена вялікая праца па стварэнні друкарні. У горадзе па вуліцы М. Багдановіча, дзе цяпер размяшчаецца Сувораўскае ваеннае вучылішча, напярэдадні вайны знаходзілася Аб'яднаная беларуская вайсковая школа, а таксама рэдакцыя газеты «Чырвонаармейская праўда» (зараз гэта «Беларуская ваенная газета»). Акупаваўшы Мінск, фашысты арганізавалі ў гэтым будынку сваю друкарню. У ёй працавала група ваеннапалонных, накіраваных сюды з канцэнтрацыйнага лагера, які знаходзіўся ў Мінску, па Лагойскім тракце. Дзякуючы мужнасці,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гераізму патрыётаў у снежні 1941 г. у склепе былога клуба Асаавіяхіма (вул. Астроўскага, 7) была арганізавана нелегальная друкарня Мінскага падпольнага гаркама партыі. У друкарні Мінскага падпольнага гаркама партыі было надрукавана каля 3 тыс. лістовак. У студзені 1942 г. выйшаў «Веснік Радзімы» – першы падпольны друкаваны орган у акупаваным Мінску. У архівах захаваліся тры экзэмпляры гэтага лістка ад 18, 25 студзеня і 1 лютага 1942 г. Рэдактарам лістка быў Н. І. Талкачоў. У гэтай друкарні было арганізавана таксама друкаванне лістовак і зваротаў да ўсяго насельніцтва Беларусі.

На працягу трох месяцаў у падвальным памяшканні працавала падпольная друкарня. У сакавіку 1942 г. у Мінску пачаліся масавыя арышты. Былі схоплены і пакараны смерцю супрацоўнікі друкарні Н. І. Талкачоў, М. В. Чыпчын, Н. І. Іваноў і іншыя патрыёты-друкары [2].

Улічваючы важнасць і сілу ўздзеяння друкаванай прадукцыі, падпольныя партыйныя органы імкнуліся ствараць уласныя друкарні. Працяглыя шматкіламетравыя пераходы ад месцаў дыслакацыі партызанскіх атрадаў да друкарні па тылах ворага абмяжоўвалі магчымасці хуткага выпуску газет, уяўлялі сур’ёзную небяспеку. Так, Смалявіцкі падпольны райкам партыі сумесна з камандаваннем атрада «Смерць фашызму» зімой 1943 г. паставілі задачу стварыць уласную друкарню. Шмат энергіі, ініцыятывы і настойлівасці ў здабыванні шрыфта, друкарскай фарбы, паперы, вырабе матрыц і стварэнні базы выдавецкай справы праявілі Г. С. Якімовіч, В. М. Бачароў, В. Бандарчук, В. І. Бондараў, наборшчык В.Сопатаў.

Вялікую працу па выпуску друкаванай прадукцыі правялі падпольшчыкі і партызаны Слуцкага раена. Так, падпольшчык А. Р. Прохараў, які працаваў у гарадской друкарні, вынес і перадаў партызанам атрада В. З. Каржа каля 20 кг друкарскага шрыфта і фарбы. Падпольшчыкі горада перадалі партызанам паперу і пішучую машынку. 30 снежня 1942 г. у друкарні Слуцкага РК КП(б)б былі выпушчаны першыя лістоўкі «Весткі з фронту» накладам 200–300 асобнікаў. З 1 студзеня да чэрвеня 1943 г. выходзіла газета «Патрыёт Радзімы» – орган Слуцкага падпольнага межрайкома партыі (рэдактар К. Н. Клюйко). З 1 красавіка 1943 г. пачала выдавацца газета «Народны мсцівец» як орган Слуцкага райкома КП(б)б (рэдактар Н. Е. Дастанка). У тыле ворага было выпушчана 77 нумароў газеты агульным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

накладам 37 300 асобнікаў. У друкарні гэтай газеты былі надрукаваны 72 тыс. лістовак [4].

Наладжванне выдання газет на акупаванай тэрыторыі было спалучана з вялікімі цяжкасцямі і патрабавала пэўнага часу. Так, на канец 1942 г. у Беларусі выдавалася 10 ці крыху больш газет. Яркую старонку ў гісторыю падпольнага друку на акупаванай ворагам тэрыторыі ўпісала газета «Звязда», якая выдавалася ў Мінску. Яе выданне было арганізавана па ініцыятыве У.С. Амельянюка (8 траўня 1965 г. Уладзіміру Сцяпанавічу Амельянюку пасмяротна нададзена званне Героя Савецкага Саюза). Пасля яго трагічнай гібелі выданнем «Звязды» кіраваў В. К. Нікіфараў. Першы нумар «Звязды», падрыхтаваны і адрэдагаваны У. С. Амельянюком, быў набраны нелегальна ў друкарні імя І. В. Сталіна на рускай мове. Набор па частках быў дастаўлены на кватэру М. П. Воранава і 18 мая 1942 г. надрукаваны ў абсталяванай падпольнай друкарні. У чэрвені гэты нумар друкуецца дадатковым накладам. Наступныя нумары выходзяць у свет ў жніўні – верасні 1942 г., іх набраў
Х. М. Александровіч у падпольнай друкарні, перабазіраванай на кватэру Т. Е. Якавенкі.

Падпольная газета «Звязда» выклікала радасць яе сяброў і лютую злосць ворагаў. Фашысты збіліся з ног у пошуках падпольнай друкарні, арганізатараў выпуску і распаўсюджванні «Звязды». За іх выдачу гаўляйтар Беларусі В. Кубе абяцаў узнагароду ў 50 тыс. нямецкіх марак. Аднак фашыстам не ўдалося выявіць падпольную друкарню. І толькі масавы арышт мінскіх падпольшчыкаў у верасні 1942 г. прывеў да спынення выдання газеты. Падрыхтаваны да друку пяты нумар «Звязды» не пабачыў свет. Усяго ж за май – верасень 1942 г. выйшла чатыры нумары газеты [11].

Баявую вахту «Звязда» працягнула ў партызанскім краі. У студзені 1943 г. у Любанскі раен з-за лініі фронту прыбыў дасведчаны журналіст М. П. Барашкаў, які да вайны працаваў рэдактарам рэспубліканскай камсамольскай газеты «Чырвоная змена». Ен даставіў з Вялікай зямлі партатыўную друкарскую машынку, наборныя касы са шрыфтамі, іншыя матэрыялы, неабходныя для выдання газеты. На месцы былі падабраны кадры журналістаў і друкароў, створаны добры калектыў супрацоўнікаў.

27 студзеня выйшаў першы нумар «Звязды». Журналісты газеты пастаянна наведвалі партызанскія атрады і брыгады, населеныя пункты, збіраючы неабходны для чарговых нумароў матэрыял.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У студзені 1944 г. гітлераўцы распачалі супраць Мінскага партызанскага злучэння чарговую карную экспедыцыю. Народныя мсціўцы з баямі прабіваліся на захад. Толькі вясной рэдакцыя вярнулася ў Любанскі раён, на месцы ранейшага размяшчэння. Аднавіць выпуск газеты адразу не атрымалася, бо не было паперы. Супрацоўнікі рэдакцыі дапамагалі ў выданні газеты сваім калегам з слуцкага «Народнага мсціўца», якія мелі невялікі запас шэрай абгортачнай паперы.

Выданне газет і лістовак у падпольных тыпаграфіях было выклікана тым, што цэнтральных, рэспубліканскіх, вайсковых газет не хапала для задавальнення запытаў народа. Выданне друкаванай прадукцыі ў тыле ворага дазволіла аператыўна і ў поўнай меры адлюстроўваць падзеі, якія адбываліся за лініяй фронту, улічваць спецыфіку таго ці іншага акупаванага раёна і весці дыферэнцыраваную прапаганду сярод розных груп партызан.

Даследаванне дадзенай праблемы дае магчымасць аспрэчыць фальсіфікатараў партызанскага руху аб тым, што ў партызанскіх фарміраваннях значыліся «нег255граматныя, цёмныя і адсталыя бандзіты».

Веданне карціны чытання партызан дазваляе паказаць вытокі патрыятызму, ролю ідэялагічнай працы, якая праводзілася ў гады Вялікай Айчыннай вайны.


1. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945. – Мінск : БЕЛТА, 2005. – 544 с.

2. Вечерний Минск. – 1984. – 2 авг.

3. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т. – Минск : Беларусь, 1983–1985.

4. *Грицкевич, А. П.* Древний город на Случи / А. П. Грицкевич. – Минск : Полымя, 1985. – С. 71–80.

5. Гомельская праўда. – 1985. – 5 мая.

6. Звязда. – 1964. – 19 крас.

7. Зборнік лістовак усенароднай партызанскай барацьбы ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945 гг.). – Мінск : Дзяржвыд БССР, 1952. – 546 с.

8. *Иваненко, П.* В родных местах: воспоминания подпольщика и партизана П. Иваненко / П. Иваненко. – Минск : Беларусь, 1971. – 256 с.

9. *Каплан, Г. Л.* Сила партийного слова / Г. Л. Каплан // Партийное подполье в Белоруссии, 1941-1944 : Витебская, Могилевская, Гомельская, Полесская области. Страницы воспоминаний : [сборник] / Грабовский, Семен Кузьмич ; Институт истории АН БССР; Институт истории партии при ЦК КП Белоруссии – филиал Института марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. –


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Минск : Беларусь, 1985. – С. 339–347.
10. *Лабанок, У.* Бальшавікі Віцебшчыны – арганізатары барацьбы працоўных вобласці супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў / У. Лабанок // Камуніст Беларусі. – 1952. – № 1. – С. 39.
11. Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии. – Ч. 2. – Минск : Беларусь, 1967. – 586 с.
12. Советские партизаны: из истории партизанского движения в годы Великой Отечественной войны. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Госполитиздат, 1963. – 797 с.
13. *Фролович, Р.* Когда мы были мальчишками / Р. Фролович // Неман. – 1973. – № 9. – С. 140.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ